# Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** Вам можа падацца, што тыдзень пачынаецца лёгка і ўдала, аднак не варта меркаваць, што так яно і ёсць. Лепш зірнуць з песімістычнага пункту гледжання. Так больш шанцаў, што тыдзень прынясе нечаканае задавальненне прыемнымі момантамі. У адваротным выпадку давядзецца пастаянна спатыкацца аб нейкія дробязі. Серада прынясе цікавую інфармацыю, да якой неабходна ўважліва прыслухацца, каб не выпусціць з-пад увагі важныя дэталі. У пятніцу перад вамі могуць адкрыцца бліскучыя далягляды, толькі праявіце рашучасць.

**ЦЯЛЕЦ.** Зоркі кажуць, што ваша жыццё стала спакайнейшым, але кашалёк — значна танчэйшы. Аднак лавіруючы паміж людзьмі і сітуацыямі, вы зможаце шмат дасягнуць. Сцеражыцеся спакус, якія пагражаюць звесці вас з вернага шляху. У суботу не выключаны канфлікт у сям'і. Памятайце, што разумны кампраміс яшчэ ніколі не шкодзіў.

**БЛІЗНЯТЫ.** На гэтым тыдні вам прадставіцца шмат магчымасцяў — імкніцеся выкарыстоўваць іх максімальна поўна. Вас чакаюць рамантыка, спатканні і здзяйсненне жаданняў. Побач акажацца менавіта той чалавек, які вам патрэбен, з якім будзе добра.

**РАК.** Пажадана суадносіць свае абяцанні з магчымасцю іх выканання. Чакаюцца перамены да лепшага. Лепш засяродзіцца на працы, не выключана, што гэта тыдзень падрыхтоўкі да вырашальнага кідка. Збярыце ўсе сілы, вызначце план дзеянняў, дамоўцеся з партнёрамі. Час спрыяльны для самарэалізацыі і праяўлення талентаў. Вы без цяжкасцяў зможаце заручыцца неабходнай падтрымкай.

**ЛЕЎ.** Усе здзяйсняюць памылкі, і мудрасць жыцця заключаецца ў тым, каб іх не паўтараць, а здабываць пазітыўны вопыт з жыццёвых цяжкасцяў. Не атрымалася з першага разу — паспрабуйце яшчэ, толькі ідзіце іншым шляхам. Не сыходзьце з дыстанцыі пры першых жа цяжкасцях.

**ДЗЕВА.** Надышоў час для нарошчвання актыўнасці ў сферы прафесійнай дзейнасці. Па магчымасці будзьце ўважлівыя і асцярожныя, паколькі поспех не церпіць памылак і нядбайнасці. Вам прадставіцца магчымасць наладзіць любыя сувязі і кантакты, якія толькі пажадаеце. У выхадныя не варта збіраць негатыўныя эмоцыі. Вам неабходна разрадзіцца, толькі не на навакольных. У нядзелю самота дапаможа спланаваць дзеянні на найбліжэйшую будучыню.

**ШАЛІ.** Варта праявіць асцярожнасць, бо магчымыя правакацыі з боку канкурэнтаў у справах і ў каханні. Перш чым прымаць рашэнне, добра падумайце, не дзейнічайце з гарачкі. На працы ў вас з'явіцца магчымасць паказаць сваю карысць і незаменнасць, але не захапляйцеся, гэта не трэба даказваць усім запар.

**СКАРПІЁН.** Надыходзіць спрыяльны перыяд у шматлікіх сферах і кірунках. Ужо ў панядзелак вас чакаюць шанцаванне і дадатковы прыбытак. Чацвер прынясе невялікі, але важны поспех, і вы адчуеце, як свет любіць вас. Для кахання цяпер наогул выдатны перыяд.

**СТРАЛЕЦ.** Пастарайцеся хоць бы на гэтым тыдні разгрузіць сябе ад лішніх кантактаў і чужых спраў. У панядзелак нечаканыя праблемы могуць затармазіць вас, стаміць і нават давесці да стрэсу. Не апускайце рукі — у вас усё атрымаецца, але спатрэбіцца на парадак больш намаганняў. У сераду варта кінуць сілы на вырашэнне старых праблем, вынік вельмі парадуе. У выхадныя імкніцеся ва ўсім выконваць меру, інакш жаданне як след адпачыць пасля цяжкага тыдня пагражае нашкодзіць.

**КАЗЯРОГ.** У панядзелак лепш прамаўчаць, гэта засцеражэ ад непатрэбных канфліктаў і не дасць магчымасці нядобразычліўцам умяшацца ў ход падзей. У аўторак можаце сутыкнуцца з рознага кшталту бюракратычнымі праблемамі, не прымайце гэта за паражэнне. Пятніца — дзень для цярплівай і карпатлівай працы, не выпускайце з-пад увагі нават самыя нязначныя дробязі. У суботу адпачывайце і забаўляйцеся, але думайце пра наступствы.

**ВАДАЛІЎ.** У вашым жыцці надыходзіць добры перыяд, нават можна сказаць, новы этап. У пачатку тыдня верагодныя цікавыя сустрэчы і перспектыўныя знаёмствы. Для дасягнення вынікаў на працы давядзецца выявіць вытрымку і настойлівасць. Серада можа стаць складаным і напружаным днём, будзьце разважлівыя, каб не трапіць на вуду падману. У выхадныя паклапаціцеся пра сваіх блізкіх, ім неабходная ваша ўвага.

**РЫБЫ.** Тыдзень складаны і даволі эмацыянальна напружаны. У панядзелак захоўвайце ва ўсім асцярожнасць, старайцеся не рызыкаваць. У сераду пажадана перагледзець свае планы і праявіць гібкасць. Рух па кар'ернай лесвіцы магчымы толькі пры ўмове павышэння прафесійнага ўзроўню. Могуць аднавіцца нядаўна перапыненыя дзелавыя і асабістыя кантакты. У пятніцу даруйце чалавеку, які вас нечым пакрыўдзіў.

## Даты Падзеі Людзі

### 4 ЛЮТАГА

У краіне

**1515** год — нарадзіўся Мікалай Радзівіл (па мянушцы Чорны), дзяржаўны і ваенны дзеяч ВКЛ. Адзін з прадстаўнікоў найбуйнейшага магнацкага роду, вялікі канцлер літоўскі, ваявода віленскі, адміністратар Лівоніі. У 1555 годзе перайшоў з лютэранства ў кальвінізм, выдаў на свае сродкі Біблію ў Берасці (1563). Узначальваў дзяржаўную камісію па правядзенні аграрнай рэформы ў гаспадарчых маёнтках. Падтрымліваў палітычны саюз з Польшчай, аднак быў рашучым праціўнікам федэрацыі з ёй і адстойваў суверэнітэт Вялікага Княства Літоўскага. Пры ім Брэст і Нясвіж сталі цэнтрамі пратэстантызму ў Беларусі і Літве, адкрыты Брэсцкія і Нясвіжскія друкарні.

**1808** год — нарадзіўся (фальварак Панюшкавічы, Бабруйскі павет) Вінцэнт (Вікенцій Іванавіч) Дунін-Марцінкевіч, беларускі паэт, драматург, тэатральны дзеяч; заснавальнік новай беларускай літаратуры, прафесійнай драматургіі і тэатра. З 1826 года працаваў у Мінскай епархіяльнай кансісторыі, у крымінальным судзе. Пісаў адначасова на дзвюх мовах — польскай і беларускай. Унёс уклад у развіццё сілабічнага вершаскладання, у распрацоўку новых жанрава-стылістычных формаў (вершаваныя аповесць і апавяданне, балада, камедыя, ідылія). Аўтар камедый «Пінская шляхта» і «Залёты», паэтычных кніг «Гапон», «Вечарніцы і апантаны», «Дудар беларускі, ці Усяго патроху». Да гэтага часу на сцэнах тэатраў ідуць яго п'есы «Ідылія», «Пінская шляхта», «Залёты». У 1859 годзе пераклаў на беларускую мову забароненую цэнзурай паэму А. Міцкевіча «Пан Тадэвуш». Стварыў першы беларускі нацыянальны тэатр (1852—1856). Тэатральная дзейнасць Дуніна-Марцінкевіча паслужыла падмуркам для далейшага развіцця беларускай драматургіі і прафесійнага тэатра.

**1943** год — мінскі падпольшчык Іван Кабушкін быў схоплены гітлераўцамі пры выкананні баявога задання, пасля чаго закатаваны ў фашысцкіх засценках. У 1965 годзе Івану Кабушкіну пасмяротна было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

У свеце

**1789** год — калегія выбаршчыкаў абрала Джорджа Вашынгтана першым прэзідэнтам ЗША.

**1794** год — Вялікая французская рэвалюцыя: Нацыянальны канвент адмяняе рабства ў Францыі і яе калоніях.

**1873** год — нарадзіўся Міхаіл Міхайлавіч Прышвін, рускі савецкі пісьменнік. Аўтар кніг «Кладоўка сонца», «Карабельны гай» і іншых. Сам Прышвін сваёй галоўнай кнігай лічыў «Дзённікі», якія вёў на працягу амаль паўстагоддзя (1905—1954) і аб'ём якіх у некалькі разоў большы за самы поўны, 8-томны, збор яго твораў. Апублікаваныя ў 1980-х гадах, яны дазволілі па-іншаму зірнуць на М. М. Прышвіна і яго творчасць. Пастаянная духоўная праца, шлях пісьменніка да ўнутранай свабоды падрабязна і ярка прасочваецца ў яго багатых назіраннямі дзённіках («Вочы зямлі», 1957; цалкам апублікаваныя ў 1990-х гадах), дзе, у прыватнасці, дадзена карціна працэсу «раскрестьянивания» Расіі і негатыўных з'яў савецкай рэчаіснасці; выказана гуманістычнае імкненне пісьменніка зацвердзіць «святасць жыцця» як найвышэйшую каштоўнасць.

Так гаварыў...

**ПОЛЬ ВЕРЛЕН:**

*«Кахаць — гэта адзіны сэнс жыцця. І сэнс сэнсаў, сэнс шчасця».*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.51 | 17.56 | 9.05 |
| Віцебск — | 8.46 | 17.41 | 8.55 |
| Магілёў — | 8.42 | 17.46 | 9.04 |
| Гомель — | 8.33 | 17.48 | 9.15 |
| Гродна — | 9.06 | 18.12 | 9.06 |
| Брэст — | 9.01 | 18.17 | 9.16 |

## Месяц

***Першая квадра***
***28 студзеня.***
***Месяц у сузор'і Льва.***

## Імяніны

***Пр.*** *Гаўрылы, Георгія, Івана, Макара, Мікалая, Пятра, Цімафея, Якава.*
***К.*** *Веранікі, Андрэя, Юзафа.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Пры пераездзе трасца, назапашаная за час пражывання ў аднапакаёвай кватэры, у двушку чамусьці ніяк не залазіць.**

Мужык расказвае прыяцелю:

— Мы з жонкай сустрэліся на дыскатэцы...

— Як рамантычна!

— Ды куды ўжо больш рамантычна! Я думаў, што яна дома з дзецьмі сядзіць...

**Калі я прыношу табе сняданак у ложак, то ад цябе мне дастаткова простага «дзякуй». Не трэба вось гэтых пытанняў: «Хто ты?», «Што робіш у маім доме?»**



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10.675. Індэкс 63850. Зак. № 411.

Нумар падпісаны ў 19.30 3 лютага 2023 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12